УДК 82-1(476)=124=161.3

# СОПОЛОЖЕНИЕ ОБРАЗОВ ЯГАЙЛО И СИГИЗМУНДА В ПОЭМЕ «ПРУССКАЯ ВОЙНА»: ПРЕЕМСТВЕННОСТЬ, ПРООБРАЗ, МИФОТВОРЧЕСТВО

***А. В. ЕФИМОВ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

На основе современных междисциплинарных подходов рассматривается соположение (взаимосвязь) образов Ягайло и Сигизмунда в поэме Яна Вислицкого «Прусская война». Высказывается гипотеза, что Ягайло выступает не только как самостоятельный персонаж, но и как прообраз своего потомка, а его биография содержит определенный прогноз относительно того, какой будет (должна быть) биография Сигизмунда. Обращается внимание на свойственное эпохе Ренессанса мифотворчество в поэме.

***Ключевые слова:*** «Прусская война»; латиноязычная поэзия Беларуси; белорусская литература; Ренессанс; прообраз; мифотворчество; предопределение в литературе; семиотика культуры; герменевтика.

# СУПАСТАЎЛЕННЕ ВОБРАЗАЎ ЯГАЙЛЫ І ЖЫГІМОНТА Ў ПАЭМЕ «ПРУСКАЯ ВАЙНА»: ПЕРАЕМНАСЦЬ, ПРАВОБРАЗ, МІФАТВОРЧАСЦЬ

***А. В. ЯФІМАЎ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

На аснове сучасных міждысцыплінарных падыходаў разглядаецца ўзаемасувязь вобразаў Ягайлы і Жыгімонта ў паэме Яна Вісліцкага «Пруская вайна». Выказваецца гіпотэза, што Ягайла выступае не толькі як самастойны персанаж, але і як правобраз свайго нашчадка, а яго біяграфія ўтрымлівае пэўны прагноз наконт таго, якой будзе (павінна быць) біяграфія Жыгімонта. Звяртаецца ўвага на ўласцівую эпосе Рэнесансу міфатворчасць у паэме.

***Ключавыя словы:*** «Пруская вайна»; лацінамоўная паэзія Беларусі; беларуская літаратура; Рэнесанс; правобраз; міфатворчасць; наканаванне ў літаратуры; семіётыка культуры; германеўтыка.

**Образец цитирования:**
Яфімаў АВ. Супастаўленне вобразаў Ягайлы і Жыгімонта ў паэме «Пруская вайна»: пераемнасць, правобраз, міфатворчасць. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2019;1:39–45.

**For citation:**
Yafimau AV. Juxtaposition of the images of Jagiello and Sigismund in the poem «The Prussian War»: continuity, prototype, myth-making. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2019;1:39–45. Belarusian.

**Автор:**
***Александр Викторович Ефимов*** – аспирант кафедры истории белорусской литературы филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Ж. В. Некрашевич-Короткая.

**Author:**
***Aliaksandr V. Yafimau***, postgraduate student at the department of history of Belarusian literature, faculty of philology.
*lexdelirium@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-2186-8744*

# JUXTAPOSITION OF THE IMAGES OF JAGIELLO AND SIGISMUND IN THE POEM «THE PRUSSIAN WAR»: CONTINUITY, PROTOTYPE, MYTH-MAKING

*A. V. YAFIMAU* [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

On the basis of today's interdisciplinary approaches considered juxtaposition images Jagiello and Sigismund in the poem of Joannis Vislicensis «The Prussian War». It is hypothesized that Jagiello is indicated not only the comments as an independent character, but also as a type of his offspring, and his biography contains some predictions about what will be (should be) Sigismund's biography. It draws attention to the characteristic of the Renaissance myth-making in the poem.

***Key words:*** «The Prussian War»; Latin poetry of Belarus; Belarusian literature; Renaissance; prototype; myth-making; predestination in the literature; semiotics of culture; hermeneutics.

«Пруская вайна» (*Bellum Prutenum*) – героіка-эпічная паэма Яна Вісліцкага, выдадзеная ў Кракаве ў 1516 г. у якасці ключавога твора аднайменнага зборніка. Паэма вывучалася шэрагам замежных, галоўным чынам польскіх [1, s. 226–229; 2, s. 210; 3; 4; 5, s. 195], а таксама айчынных навукоўцаў (гл., напрыклад, [6; 7]). Сярод апошніх варта вылучыць Віктара Іванавіча Дарашкевіча, які з'яўляўся адным з піянераў комплекснага вывучэння лацінамоўнай паэзіі ў беларускім літаратуразнаўстве [8; 9], і Жанну Вацлаваўну Некрашэвіч-Кароткую, якая пераклала ўвесь зборнік [10] на беларускую мову і прысвяціла «Прускай вайне» асобныя раздзелы сваіх кніг [11; 12].

У рэчышчы дадзенага артыкула засяродзім увагу толькі на супастаўленні вобразаў Ягайлы і Жыгімонта і цесна звязаным з ім матыве наканавання. Менавіта наканаванне з'яўляецца злучальным звяном паміж мастацкім часам і часам напісання паэмы, паміж галоўным героем Ягайлам і Жыгімонтам I. Адна з адметнасцей паэмы «Пруская вайна» заключаецца ў тым, што Абраным, народжаным па волі багоў з'яўляецца не Ягайла, а яго ўнук Жыгімонт. Нярэдка ключавыя персанажы эпічных твораў надзяляліся пэўнай функцыяй, значнай для будучыні (найбольш характэрным прыкладам у дадзеным выпадку з'яўляецца «Энеіда» Вергілія), аднак звычайна наканаванне датычыцца менавіта галоўнага героя, а не яго нашчадкаў. Формула *прадказанне пра з'яўленне Абранага – галоўны герой твора з'яўляецца Абраным* падаецца больш распаўсюджанай, чым формула *галоўнаму герою прадказваюць, што Абраным будзе нехта з яго нашчадкаў*. Апошняя ўвогуле здаецца больш тыповай для рэлігійнай літаратуры, чым для мастацкай. Таму абвяшчэнне Жыгімонта I богаабраным праз услаўленне яго продка Ягайлы, багата падмацаванае ўмяшаннем звышнатуральных істот, заслугоўвае асаблівай увагі даследчыка.

Адметна, што паэма, нягледзячы на заяўленую назву, насамрэч не пра Прускую вайну (і не пра Грунвальдскую бітву ў прыватнасці). У цэнтры твора – услаўленне дынастыі Ягелонаў, галоўным чынам самога Ягайлы, а таксама яго ўнука, сучаснага Яну Вісліцкаму манарха Жыгімонта I, якому і быў прысвечаны зборнік. На першы погляд здаецца, што паэме ўвогуле больш пасавала б назва «Ягайлаіда» або «Ягеланіда» (па аналогіі з «Энеідай»), на што звярталі ўвагу і замежныя даследчыкі [13, s. 225]. Існуючая ж назва ўводзіць чытача, у тым ліку адукаванага, у зман, паколькі твор не змяшчае шырокага і гістарычнага апісання вайны з крыжакамі. Такая неадпаведнасць заяўленай назвы і зместу неаднаразова станавілася прадметам крытыкі [2; 14].

Аднак звернем увагу на цікавую дэталь: у эпіграме на зборнік сам аўтар пазначыў, што яго кніга пра *fata duelli* (літаральна – 'лёс бітвы', што можна разумець і як ход вайны, і як яе **выніκі**) [10, с. 100–101]. А вось што пісаў Ян Вісліцкі ў прысвячэнні Паўлу Кросненскаму: *...разважаючы пра тую славуцейшую перамогу, якую палякі атрымалі над германцамі ў межах Прусіі з дапамогаю Марса, я ўзяўся падрабязна абдумваць у сэрцы адметны* ***вынік*** *яе* (вылучана мной. – *А. Я.*) [10, с. 106].

Зыходзячы з гэтага можна выказаць гіпотэзу, што аўтар разглядаў узвышэнне Ягайлы менавіта як **вынік** вайны, якая стала неабходнай умовай шлюбу манарха з Соф'яй, заснавання дынастыі Ягелонаў, станаўлення магутнай Польшчы і нараджэння Жыгімонта I. Такім чынам, вайна з крыжакамі з'яўляецца ў паэме не прадметам апісання (як, напрыклад, Траянская вайна ў «Іліядзе»), а толькі падзеяй, якая дазволіла Ягайлу стаць Ягайлам. Кажучы сучаснай мовай сінергетыкі, Пруская вайна выступае ў творы кропкай біфуркацыі, якая змяняе адну стабільную сістэму (развіццё Польшчы і Літвы паасобку) на іншую, якасна лепшую з пазіцыі Яна Вісліцкага (дынастычная унія Польшчы і Літвы праз шлюб Ягайлы і Соф'і Гальшанскай). Калі так, нівеліруецца ўсялякая крытыка адносна неадпаведнасці назвы і зместу, кампазіцыі і г. д.

Разам з гэтым можна заўважыць, што аўтар, усхваляючы Жыгімонта праз Ягайлу, фактычна выкарыстоўвае так званы **праўобраз**. Гэта паняцце раскрываецца Г. А. Верклерам наступным чынам: «Праўобраз – гэта пэўныя прадстаўнічыя адносіны, якімі канкрэтныя асобы, падзеі і ўстанаўленні звязаны з адпаведнымі асобамі, падзеямі і ўстанаўленнямі больш позняга часу...»[1] [15, с. 98]. Падкрэслім, што дадзенае паняцце было выведзена індуктыўным метадам пры аналізе біблейскіх **тэкстаў**. Фактычна Г. А. Верклер сфармуляваў адпаведную дэфініцыю ў выніку працы з **помнікамі літаратуры**, пры гэтым пазатэкставыя фактары пад увагу не браліся. Насамрэч тэрмін «праўобраз» не абавязкова прачытваецца ў рэчышчы біблейскай экзегетыкі, а знаходзіцца ў адным шэрагу з паняццямі алегорыі, сімвала і г. д., што дазваляе выкарыстоўваць яго не толькі ў дачыненні да Бібліі, але і ў адносінах да мастацкіх літаратурных твораў. Пры гэтым, аднак, павінны захоўвацца ключавыя характарыстыкі дадзенага паняцця:

1) «Павінен існаваць які-небудзь пункт падабенства або аналогіі паміж праўобразам і вобразам. Гэта, аднак, не выключае, што паміж імі не можа быць  мноства адрозненняў»;

2) «…падабенства можна лічыць праўобразам тады, калі ёсць які-небудзь доказ Боскага пацверджання адпаведных праўобразаў і вобразаў, хоць такое пацверджанне можа быць фармальна і не выяўлена» (адносна Бібліі – *А. Я.*) [15, с. 98]. Пры гэтым некаторыя мяркуюць, што нічога нельга лічыць праўобразам, калі пра гэта дакладна не напісана або не сказана Богам (адносна Бібліі). Аднак, з іншага боку, існуе меркаванне, быццам праўобразам з’яўляецца ўсё, што мае падабенства з тым, што сустракаецца ў будучым. Большая ж частка даследчыкаў займае сярэднюю пазіцыю. У дадзеным выпадку можна адштурхоўвацца ад самай нязручнай характарыстыкі, але ўсё роўна сувязь Ягайлы з Жыгімонтам падыходзіць пад паняцце праўобраза, бо ў межах твора існуюць свае багі, якія якраз і кажуць пра падабенства герояў;

3) «Праўобраз павінен адлюстроўваць тое, што адбудзецца ў будучыні. Праўобразнасць – асобая форма прароцтва» [15, с. 98].

Такім чынам, у тэксце паэмы «Пруская вайна» існуюць усе неабходныя элементы, якія адпавядаюць характарыстыкам паняцця праўобраза, таму ўжыванне гэтага тэрміна апраўданае. Акрамя таго, паэту не абавязкова ведаць слоўнікавае вызначэнне паняцця «метафара», сфармуляванае тэарэтыкамі літаратуры, каб выкарыстоўваць метафары ў сваіх творах. Аналагічна і з праўобразам.

Фактычна пра выкарыстанне Янам Вісліцкім праўобраза піша Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая: «...перамога ў Грунвальдскай бітве з’яўляецца найлепшым аргументам для ўсіх цяперашніх і будучых ворагаў на карысць ваеннай моцы Жыгімонта: раз яго дзед Ягайла здабыў гэтую слаўную перамогу, то і ўнук, без сумненняў, будзе вартым прадаўжальнікам яго ратнай справы. Вось чаму “felix fama” (“слаўная чутка”) у экспазіцыі паэмы спалучаецца са зваротам да Жыгімонта і служыць мастацкім  сродкам сімвалічнага паяднання караля-сучасніка з яго “мужным продкам” – Ягайлам...» [10, с. 51].

Аднак даследчыца і перакладчыца канцэнтруе ўвагу толькі на аказіянальнай ідыёме «слаўная чутка», хоць падаецца, што гэта проста адно з канкрэтных праяўленняў праўобраза ў паэме «Пруская вайна». Тое ж датычыцца і «сімвалічнага дыялогу» паміж Ягайлам і Жыгімонтам, пра які таксама піша Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая [12, с. 21].

Такім чынам, узаемаадносіны паміж Ягайлам і Жыгімонтам у паэме знаходзяцца не толькі на прамой лінейнай шкале (Ягайла – у мінулым адносна Жыгімонта): у адпаведнасці з паняццем праўобраза ўмоўная лінія лёсу Жыгімонта павінна хоць часткова дубліраваць лінію лёсу Ягайлы па контуры. Насамрэч так і адбываецца, што бачна пры згадванні бітвы пад Оршай (Пруская Вайна, III, 251–255) [10, с. 169]. Больш за тое, Ян Вісліцкі нават выходзіць за межы мастацкага часу і піша «параду», накіраваную ў сапраўдную будучыню:

*Выйдзі з суровай вайною да земляў далёкіх і блізкіх,*
*Што амываюцца водным бязмежжам глыбокага мора, –*
*Чорны індус, назамон – пагроза на моры, парфянін*
*І македонец, яшчэ егіпцянін абходзяць там нівы;*
*Ты прывядзі іх да ўлады сваёй, а другія дзяржавы*
*Хай дасылаюць галіну аліўкі табе са спагадай,*
*Дзіўныя хай гарады для цябе адчыняюць вароты,*
*Плешча няхай у твой гонар фракійскі Басфор невычэрпны,*
*Каб авалодаць ты мог зямлёй візантыйскай, якую*
*Вельмі даўно святары захапілі з турэцкай дзяржавы.*
*Хай верна служыць табе і край недалёкі таўрыйскі,*
*Што падначалены быў уладарнікам польскім калісьці…* [10, с. 169, 171].

[1] Тут і далей пераклад з рускай мовы мой. – *А. Я.*

Прэтэнзіі на візантыйскія землі можна абгрунтаваць тым, што Соф'я Гальшанская, жонка Ягайлы, паходзіла з дынастыі, якая вяла свой пачатак ад візантыйскіх імператараў [10, с. 73–74]. Але ў любым выпадку разуменне сутнасці правобраза падказвае, што Ян Вісліцкі раіць Жыгімонту паўтарыць дасягненні Ягайлы, толькі ў значна большым маштабе.

Разглядаючы сувязь *Ягайла – Жыгімонт* у паэме «Пруская вайна», нельга не спыніцца і на тым, што, услаўляючы апошняга, аўтар цалкам ідэалізаваў заснавальніка дынастыі, паказваючы яго выключна станоўчым персанажам. Гэта акалічнасць выклікае цікавасць, таму што, з аднаго боку, падобная ідэалізацыя наўрад ці магла з'явіцца ў беларускай літаратуры больш ранняга перыяду, а з другога боку, рэалістычны вобраз Ягайлы не дазволіў бы Яну Вісліцкаму дасягнуць патрэбных мэт па ўслаўленні Жыгімонта. Нездарма некаторыя даследчыкі паэмы «Пруская вайна» папракалі аўтара за тое, што ён выкарыстоўваў у творы «летапісны/хранікальны спосаб аповеду», але пры гэтым не абапіраўся на вядомыя гістарычныя крыніцы [10, с. 14–15] (сам паэт пісаў, што выкарыстаў «мала» такіх крыніц [11, с. 51]).

Усё становіцца на свае месцы, калі зыходзіць з таго, што аўтар свядома займаўся **міфатворчасцю**. У такім выпадку абсалютна лагічным і абгрунтаваным выглядае ўжыванне знаёмай чытачам формы («спосаб аповеду»), неабходнай для таго, каб новы змест, пакладзены ў яе, выглядаў натуральна, аўтэнтычна. Больш за тое, Ян Вісліцкі пабудаваў свой твор нібыта на аснове народных паданняў. Нібыта – таму што немагчыма высветліць, ці сапраўды паэт звяртаўся да фальклору, а калі так, то ў якой ступені «Пруская вайна» адпавядае гэтым паданням. Так ці інакш, здаецца, аўтар імкнуўся, каб змест паэмы ўспрымаўся не проста як мастацкі вымысел, заснаваны на сапраўдных падзеях, а як паэтычная перапрацоўка гістарычнага падання [2, с. 210].

Умоўная «фальсіфікацыя» ў паэме «Пруская вайна» заключаецца ў тым, што Ягайла безапеляцыйна падаецца галоўным героем і амаль адзінаасобным пераможцам у Грунвальдскай бітве, што супярэчыць гістарычным звесткам. Наканаванне, дапамога антычных багоў і святога Станіслава – мастацкія прыёмы, выкарыстанне якіх не скажае рэальных падзей, хоць і надае ім новую інтэрпрэтацыю, дадатковае значэнне. Напрыклад, паводле Яна Длугаша, перад Грунвальдскай бітвай Ягайла праслухаў дзве імшы запар, а потым яшчэ маліўся асобна, тым самым марудзячы з пачаткам бою, нягледзячы на рызыку нападу крыжакоў, якія былі зусім побач, і адпаведныя папярэджанні Вітаўта [16, с. 86–87]. Аб'ектыўна гэта сведчыць пра нерашучасць і баязлівасць караля, але ў паэме Яна Вісліцкага малітва Ягайлы садзейнічае заступніцтву святога Станіслава, гэта значыць мае практычнае (і нават вырашальнае) значэнне. Такім чынам, аўтар захаваў гістарычны факт, хоць дазволіў сабе зрабіць яго мастацкую інтэрпрэтацыю. Тое ж датычыцца і звестак пра шлюб Ягайлы з Соф'яй і з'яўленне нашчадкаў – сапраўдныя факты падаюцца ў казачнай форме (усё адбываецца быццам па волі антычных багоў). Аднак агульнае апісанне ролі Ягайлы ў перамозе над крыжакамі належыць да іншай сферы, бо ў дадзеным выпадку адбываецца менавіта скажэнне гісторыі, незалежна ад таго, рэалістычна гэта робіцца або не. Ці свядома Ян Вісліцкі перабольшыў ролю Ягайлы ў Грунвальдскай бітве – пытанне адкрытае. Падаецца, што так. Звернемся да гістарыяграфіі.

З даўніх часоў гісторыю выкарыстоўвалі для легітымізацыі ўлады, доказу высакародства паходжання яе прадстаўнікоў, паразумення паміж рознымі сацыяльнымі або нацыянальнымі супольнасцямі ці ўмацавання нацыянальнай перавагі. З дапамогай гісторыі абгрунтоўвалі неабходнасць рэстаўрацыі мінулага, апраўдвалі сучаснае і прагназавалі будучае [17, с. 357]. Аднак на практыцы на працягу ўсяго Сярэднявечча ў гістарычных сачыненнях ужываўся прынцып *usque ad tempus scriptoris* (*да часу пісьменніка*). Гэта значыць, што сярэднявечныя хронікі, аналы і летапісы не ствараліся кожны раз нанова, з пазіцый сучаснасці, а ў літаральным сэнсе спісваліся ў папярэднікаў, чый аўтарытэт не ставіўся пад сумненне [18, с. 558–559]. Звесткі пра папярэдні перыяд браліся з пэўнага сачынення, якое было напісана раней сучаснікам адпаведных падзей. Таму, «хоць "гісторыя" канкрэтнага аўтара магла пачынацца з колькі заўгодна аддаленага часу… яна не была ў строгім сэнсе гісторыяй "мінулага", а атрымлівалася са складання напісаных у розны час гісторый "сучаснага"» [17, с. 37].

Такім чынам, доўгі час еўрапейская гісторыя ўяўляла сабой зборнік запісаў аб сучаснасці (створаных у розныя эпохі), хоць пры гэтым магла ўтрымліваць некаторыя фальсіфікацыі, зробленыя на карысць існуючых патрэб рознага характару, а мінулае выступала тлумачэннем сучаснага. Прынцыповыя змяненні адбыліся ў эпоху Адраджэння, калі па шэрагу прычын прыйшло ўсведамленне таго, што не толькі мінулае прадвызначае сучаснае, але і сучаснасць прадвызначае будучыню. «Вызваленне ўяўленняў аб мінулым ад багаслоўскага тлумачэння прывяло да таго, што адзінкі часу дыферэнцыраваліся і напоўніліся пэўным гістарычным зместам. Гуманісты ўвялі ў метадалогію гісторыі размежаванне далёкага і блізкага мінулага, у сваю чаргу аддзеленага ад сучаснага. Сучаснае тлумачылася не як пралангацыя непасрэдна папярэдняга, а як узнаўленне далёкага мінулага» [18, с. 560].

Вельмі важным у гэтым рэчышчы з’яўляецца тое, што менавіта ў эпоху Адраджэння пачынае парушацца прынцып *да часу пісьменніка*. Іншымі словамі, аўтары пачалі ствараць працы, прысвечаныя мінуламу (у асноўным Антычнасці), грунтуючыся на ўласным досведзе і матэрыялах, якія ў іх былі.

Так, «Пруская вайна» – мастацкі, а не гістарычны (навуковы) твор, аднак у той час, калі была напісана паэма, межы паміж хронікамі, гісторыяй і мастацтвам на гістарычную тэматыку яшчэ не былі добра акрэсленымі [17, с. 27–38]. У любым выпадку аўтар сам указвае, што, спрабуючы апісаць падзеі, сведкам якіх не з’яўляўся, ён збіраў інфармацыю не толькі з хронік і кніг, але і з пагалосак і ўспамінаў [10, с. 106] і ўсё гэта яшчэ апрацоўваў і падганяў пад свае патрэбы. Нешта падобнае ўжо было ў часы Антычнасці, але для Еўропы Сярэднявечча такі падыход з’яўляўся пэўным наватарствам.

Тым не менш трансфармацыя поглядаў на мінулае прывяла да таго, што пісаць працы па гісторыі постфактум стала звычайнай справай. Пры гэтым адбывалася пэўнае праецыраванне сучаснасці (адносна часу напісання) на тое, пра што, уласна, пісалася. Такім чынам, аўтары ўжо не проста перапісвалі сваіх папярэднікаў – яны асэнсоўвалі гісторыю з вышыні свайго часу. У пэўнай ступені сучаснасць пачала ўплываць на мінулае [18, с. 561].

Новы падыход да гісторыі спрыяў таму, што з’явілася разуменне: гісторыю можна падводзіць пад патрэбы сучаснасці. Так пачалася пэўная міфатворчасць. Яскравымі прыкладамі ў дадзеным выпадку з’яўляюцца стварэнне легенды пра Палямона і адлюстраванне культу Біруты (маці Вітаўта Вялікага) у другім зводзе беларуска-літоўскіх летапісаў [19, с. 62] (у Вялікім Княстве Літоўскім), з’яўленне канцэпцыі *Масква – трэці Рым* і напісанне літаратурнага помніка «Казанне аб князях Уладзімірскіх» (у Маскові). Усе гэтыя прыклады міфатворчасці адносяцца менавіта да першай трэці XVI ст. (як і паэма «Пруская вайна»), і, паколькі яны маюць шмат агульнага, вывучэнне кожнага асобнага прыкладу з дадзенага пераліку можа ўтрымліваць ключ да разумення іншых.

Так, прасочваючы развіццё канцэпцыі *Масква – трэці Рым*, савецкі і расійскі даследчык Барыс Андрэевіч Успенскі прыйшоў да высновы, што актуальныя для мяжы XV–XVI стст. падзеі разглядаліся сучаснікамі «адначасова і як вынік іншых падзей, якія непасрэдна папярэднічалі ў мінулым, і як маніфестацыя касмалагічнага мінулага» [20, с. 31]. Паводле Б. А. Успенскага, касмалагічная мадэль усведамлення мінулага актуалізуецца пры ўспрыманні падзей, якія пачынаюць «новую эру», значную для ўсяго чалавецтва або для асобнага народа. Пры гэтым гістарычны працэс пачынае разглядацца ў міфалагічных катэгорыях і тэрмінах, а таксама адбываецца пэўная сакралізацыя гістарычных дзеячаў [20, с. 31]. Экстрапаліруючы дадзеныя тэзісы на паэму «Пруская вайна», атрымаем наступнае: пачаткам «новай эры» ў гісторыі Польшчы выступае стварэнне дынастыі Ягелонаў (немагчымае без перамогі ў Грунвальдскай бітве); рэальныя падзеі ў творы падаюцца ў міфалагічнай форме, адбываецца сакралізацыя Ягайлы. Такім чынам, твор Яна Вісліцкага ідэальна ўпісваецца ў тэарэтычную мадэль касмалагічнага ўсведамлення мінулага.

Акрамя таго, Б. А. Успенскі піша, што паводле касмалагічнай свядомасці «з цягам часу заўсёды паўтараецца адзін і той жа анталагічна зададзены тэкст. …Іначай кажучы, час заўсёды паўтараецца ў выглядзе формы, у якую ўвасабляюцца індывідуальныя лёсы і вобразы» [20, с. 42–43]. Заўважым пэўныя паралелі з тым вызначэннем правобраза, якое прапанаваў Г. А. Верклер. Прывядзём яшчэ адну характэрную цытату, у якой гэтыя паралелі падаюцца больш відавочнымі: «Касмалагічная свядомасць прадугледжвае суадносіны падзей з пэўным першапачатковым, зыходным становішчам, якое быццам бы ніколі не знікае – у тым сэнсе, што яго эмансіпацыя працягвае адчувацца ў любы час. Падзеі, якія адбываюцца ў гэтым першапачатковым часе, паўстаюць як тэкст, які заўсёды паўтараецца (узнаўляецца) у наступных падзеях. Гэты першапачатковы, анталагічна зыходны тэкст, які так ці інакш суадносіцца з усім тым, што атрымліваецца пасля, адпавядае таму, што мы звычайна разумеем пад міфам» [20, с. 26].

Усё вышэйнапісанае з’яўляецца тэарэтычнай базай, грунтуючыся на якой можна выказаць здагадку, што Ян Вісліцкі не проста «запазычыў» мадэль сувязі паміж галоўным героем паэмы Ягайлам і яго нашчадкам Жыгімонтам I з «Энеіды» (адпаведна сувязі *Эней – Аўгуст*; дынастыя Ягелонаў у паэме «Пруская вайна» ўслаўляецца падобна да таго, як услаўляецца дынастыя Юліяў у «Энеідзе»), а звярнуўся да характэрнай на той час міфалагізацыі мінулага. Аднак што ў паэме з’яўляецца, карыстаючыся тэрміналогіяй Б. Успенскага, «касмалагічным абгрунтаваннем»? Наканаванне: тое, што Жыгімонту I надаецца роля Абранага. І робіцца гэта праз «волю багоў» – фатум у першасным значэнні. Элемент наканавання ў дадзеным выпадку выступае не проста «дэкорам» – ён адыгрывае значную самастойную ролю, таму што менавіта ў ім праяўляецца ўслаўленне Жыгімонта I. З паэмы вынікае, што кароль не проста прадстаўнік славутай дынастыі і нашчадак вялікага Ягайлы, ён – народжаны па волі багоў. Фактычна Вісліцкі піша, што Жыгімонт I ёсць памазанік Божы. Так, у паэме «Пруская вайна» фігуруюць антычныя багі, аднак яны ўсё роўна з’яўляюцца сімвалам звышсілы, лёсу. Без наканавання

ўслаўленне Жыгімонта І у творы было б няпоўным: канстатацыя тых фактаў, што ён – прадстаўнік славутай дынастыі і нашчадак Ягайлы, сама па сабе ўслаўленнем не з'яўляецца.

Такім чынам, сувязь паміж вобразамі Ягайлы і Жыгімонта ў паэме «Пруская вайна» мае траісты характар. Яна з'яўляецца адначасова:

1) лінейнай прамой (рэалістычная пераемнасць ад Ягайлы да Жыгімонта; кіраванне апошняга – вынік дзейнасці першага);

2) паралельнай (Ягайла паказваецца не толькі як самастойны персанаж, але і як правобраз Жыгімонта; яго біяграфія з'яўляецца своеасаблівым патэрнам для біяграфіі нашчадка; лёс заснавальніка дынастыі выступае прагнозам таго, як складзецца лёс Жыгімонта; паміж героямі адбываецца пэўны дыялог);

3) лінейнай адваротнай (у творы адбываецца міфалагізацыя мінулага для патрэб сучаснасці; вобраз Ягайлы ствараецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія зыходзяць ад аўтарскай канцэпцыі вобраза Жыгімонта).

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Wiszniewski M. *Historya literatury polskiej. Tom 6.* Kraków: Drukarnia uniwersytecka; 1844.
2. F. M. S. [Franciszek Maksymilian Sobieszański] Wiślicy (Jan z). W: Orgelbrand S, redaktor. *Encyklopedia powszechna. Tom 27.* Warszawa: Druk S. Orgelbranda; 1867. s. 210.
3. Mecherzyński K. Jana z Wiślicy «Wojna Pruska». W: *Rozprawy i Sprawozdania z Posiedzeń Wydziału Filologicznego Akademii Umiejętności. Seria I. 1880. Tom 8.* Kraków: Akademia Umiejętności; 1880. s. 274–295.
4. Kruczkiewicz B. O Pawle z Krosna i Janie z Wiślicy. W: *Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń wydziału filologicznego Akademii Umiejętności. Seria I. Tom 12.* Kraków: Akademia Umiejętności; 1887. s. 111–142.
5. Nowak-Dłużewski J. *Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Czasy Zygmuntowskie.* Warszawa: Instytut Wydawniczy PAX; 1966.
6. Прашковіч МІ. Паэзія. У: Барысенка ВВ, Беркаў ПН, Пшыркоў ЮС, Ярош МР, рэдактары. *Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Том 1. З старажытных часоў да канца XVIII ст.* Мінск: Навука і тэхніка; 1968. с. 354–364.
7. Парэцкі Я. *Ян Вісліцкі.* Мінск: Універсітэцкае; 1991.
8. Дарашкевіч ВІ. Мастацкі помнік Грунвальду. *Помнікі гісторыі і культуры Беларусі.* 1975;3:55–59.
9. Дорошкевич ВИ. *Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: первая половина XVI века.* Минск: Наука и техника; 1979.
10. Некрашэвіч-Кароткая ЖВ, укладальнік, перакладчык. *Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Ян Вісліцкі. Пруская вайна.* Мінск: Прапілеі; 2005.
11. Некрашэвіч-Кароткая ЖВ. *Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс.* Мінск: БДУ; 2009.
12. Некрашэвіч-Кароткая ЖВ. *Шматмоўная літаратура Беларусі ў кантэксце актуальных літаратуразнаўчых канцэпцый.* Мінск: БДУ; 2015.
13. Łempicki S. *Renesans i humanizm w Polsce: materiały do studiów.* Warszawa: Czytelnik; 1952.
14. Jezienicki M. Uwagi krytyczne nad utworami łacińskimi Pawła z Krosna i Jana z Wiślicy wydanymi przez prof. Dr. B. Kruczkiewicza. *Muzeum. Czasopismo Towarzystwa Nauczycieli Szkół Wyższych.* 1888;IV(4):196–204.
15. Веклер ГА. *Герменевтика. Принципы и процесс толкования Библии.* Schaumburg, Illinois: Gospel Literature Srevices; 1995.
16. Длугош Я. *Грюнвальдская битва.* Стратановский ГА, Казанский БВ, Разумовская АВ, редакторы. Москва, Ленинград: Издательство АН СССР; 1962. (Литературные памятники).
17. Савельева ИМ, Полетаев АВ. *Теория исторического знания.* Санкт-Петербург: Алтейя; 2007. (Историческая книга).
18. Савельева ИМ, Полетаев АВ. *Знание о прошлом: теория и история. Том 1. Конструирование прошлого.* Санкт-Петербург: Наука; 2003.
19. Хроника Литовская и Жмойтская. В: Улащик НН, составитель, редактор. *Полное собрание русских летописей. Том 32.* Москва: Наука; 1975. с. 15–128.
20. Успенский БА. *Избранные труды. Том 1. Семиотика истории. Семиотика культуры.* 2-е издание, исправленное и дополненное. Москва: Язык русской культуры; 1996.

## References

1. Wiszniewski M. *Historya literatury polskiej. Tom 6* [History of Polish literature. Volume 6]. Kraków: Drukarnia uniwersytecka; 1844. Polish.
2. F. M. S. [Franciszek Maksymilian Sobieszczański] Wiślicy (Jan z). W: Orgelbrand S, redaktor. *Encyklopedyja powszechna. Tom 27.* Warszawa: Druk S. Orgelbranda; 1867. s. 210. Polish.
3. Mecherzyński K. [«Prussian War» of Jan from Wiślica]. *Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń wydziału filologicznego Akademii Umiejętności. Seria I. Tom VIII.* Kraków: Akademia Umiejętności; 1880. s. 274–295. Polish.
4. Kruczkiewicz B. [About Pawel from Krosno and Jan from Wiślica]. *Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń wydziału filologicznego Akademii Umiejętności. Seria I. Tom 12.* Kraków: Akademia Umiejętności; 1887. s. 111–142. Polish.
5. Nowak-Dłużewski J. *Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Czasy Zygmuntowskie* [Occult political poetry in Poland. Times of Sigismund]. Warszawa: Instytut Wydawniczy PAX; 1966. Polish.
6. Prashkovich MI. [Poetry]. In: Barysenka VV, Berkau PN, Pshyrkou JS, Jarosh MR, editors. *Gistoryja belaruskaj dakastrychnickaj litaratury. Tom 1. Z starazhytnyh chasow da kanca XVIII st.* [History of Belarusian pre-October literature. Volume 1. From Ancient times to the end of the XIII century]. Minsk: Nauka i tjehnika; 1968. p. 354–364. Belarusian.

7. Parjecki J. *Jan Vislicki.* Minsk: Universitjeckae; 1991. Belarusian.

8. Darashkevich VI. [Artistic monument of grunwald]. *Pomniki gistoryi i kul'tury Belarusi.* 1975;3:55–59. Belarusian.

9. Doroshkevich VI. *Novolatinskaya poeziya Belorussii i Litvy: pervaya polovina XVI veka* [Modern Latin poetry of Belarus and Lithuania: the first half of the XVI century]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1979. Russian.

10. Nekrashjevich-Karotkaja ZhV, compiler, translator. *Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Jan Vislicki. Pruskaja vajna* [Jan Vislichsky. The Prussian War]. Minsk: Prapilei; 2005. Belarusian, Latin.

11. Nekrashjevich-Karotkaja ZhV. *Belaruskaja lacinamownaja pajezija: ranni Rjenesans* [Belarusian Latin poetry: Early Renaissance]. Minsk: Belarusian State University; 2009. Belarusian.

12. Nekrashjevich-Karotkaja ZhV. *Shmatmownaja litaratura Belarusi u kantjeksce aktual'nyh litaraturaznawchyh kancjepcyj* [Multilingual Belarusian literature in the context of actual literary concepts]. Minsk: Belarusian State University; 2015. Belarusian.

13. Łempicki S. *Renesans i humanizm w Polsce: materiały do studiów* [Renaissance and humanism in Poland: educational materials]. Warszawa: Czytelnik; 1952. Polish.

14. Jezienicki M. [Critical remarks on the Latin works of Pawel from Krosno and Jan from Wiślica by prof. Dr. B. Kruczkiewicz]. *Muzeum. Czasopismo Towarzystwa Nauczycieli Szkół Wyższych.* 1888;IV(4):196–204. Polish.

15. Vekler GA. *Germenevtika. Printsipy i protsess tolkovaniya Biblii. Russkoe izdanie* [Hermeneutics. Principles and process of interpreting the Bible. Russian Edition]. Schaumburg, Illinois: Gospel Literature Srevices; 1995. Russian.

16. Dlugosh Y. *Gryunval'dskaya bitva* [Battle of Grunwald]. Stratanovskii GA, Kazanskii BV, Razumovskaya AV, editors. Moscow, Leningrad: Publishing House of Academy of Sciences of USSR; 1962. (Literary monuments). Russian.

17. Savel'eva IM, Poletaev AV. *Teoriya istoricheskogo znani*ya [Theory of historical knowledge]. Saint Petersburg: Alteiya; 2007. (Historical book). Russian.

18. Savel'eva IM, Poletaev AV. *Znanie o proshlom: teoriya i istoriya. Tom 1. Konstruirovanie proshlogo* [Knowledge of the past: theory and history. Volume 1. Designing the past]. Saint Petersburg: Nauka; 2003. Russian.

19. [Chronicles of Lithuania and Samogitia]. In: *Polnoe sobranie russkikh letopisei. Tom 32* [Complete collection of Russian chronicles. Volume 32]. Ulashchik NN, compiler, editor. Moscow: Nauka; 1975. Russian.

20. Uspenskii BA. *Izbrannye trudy. Tom 1. Semiotika istorii. Semiotika kul'tury* [Selected works. Volume 1. Semiotics of History. Semiotics of Culture]. 2nd edition, revised and additional. Moscow: Yazyki russkoi kul'tury; 1996. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 23.03.2018.*
*Received by editorial board 23.03.2018.*